# ПАМІЖ ПАЧВАРАМІ І ЗАЛАТЫМ ВЕКАМ, АЛЬБО МІФ І АНТЫМІФ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ПОСТМАДЭРНІЗМУ

А. В. Кучарава

Навуковы кіраўнік - прафесар І. Ф. Штэйнер
Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны
(філалагічны факультэт)

Адной з самых актуальных праблем літаратуразнаўства на цяперашнім, так званым постмадэрнісцкім, этапе літаратурнага развіцця з'яўляецца праблема мастацкай умоўнасці. У агульным сэнсе сфармуляваць яе можна наступным чынам: што нясе літаратуры наогул і беларускай літаратуры ў прыватнасці культываванне так званых " нерэалістычных " сродкаў мастацкага паказу. Згодна абранай методыкі доследаў з"яўленне нерэалістычных твораў разглядаецца не ў якасці індывідуальных аўтарскіх пошукаў , а менавіта як калектыўнае памкненне , якое мае сваей непасрэднай крыніцай не толькі свядомасць творцы, але , у большай ступені - "бессвядомае псіхічнае быццё нашага часу"(Юнг). У межах дадзенага навуковага " жанру " тэзісаў высветліць асноўную сутнасць гэтай праблемы немагчыма . З гэтай прычыны мы засяродзім увагу на адным са складнікаў пытання: міфатворчасць у сучаснай літаратуры.Прадметам нашага даследвання будзе неапаганства ў творчасці маладых аутараў , якое разглядаецца ў якасці адной з галоўных тэндэнцый развіцця сучаснай культуры. У цэнтры нашай увагі - як прыхільнікі класічнага неапаганства, якія арыентуюцца на традыцыі Лоурэнса, так і іх літаратурныя апаненты. Адным з апошніх можа лічыцца Адам Глёбус. У прыватнасці, меркаваць аб гэтым дае падставы зборнік навел "Дамавікамэрон".

Персанажы, якімі насяляе свой Сусвет Адам Глёбус, не станоўчыя і не адмоўныя. Мы самі вольныя зрабіць іх тымі ці іншымі. У "Дамавікамэроне" яны толькі існуюць - Кадравік, Туманнік, Целаахоўнік, Тусоўшчык, Ліфтавік, Ценявік, Сутарэннік. Менавіта толькі існуюць (прыгадаем спасылкі крытыкаў на Глёбусаўскі фактаграфізм). А справа у тым,што даваць нейкую афарбоўку гэтым героям няма сэнсу : дастаткова ўжо таго, што яны з'явіліся і ёсць. Само існаванне падобных вобразаў -- ужо своеасаблівы ход Глёбуса ў процівагу прынцыпам Лоурэнса. На першы погляд здаецца, што персанажы залежаць ад справы, якую робяць, ад прасторы, на якой здзяйсняюць свае існаванне (Шрыфтавік, Газавік, Рабаўнік, Залетнік). Але гэта толькі на першы погляд. Таму што наступо-

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ва становіцца зразумелым, што істотную ролю ў Глёбуса адыгрывае прастора. Гэтая роля засталася часу. Час у навелах з`яўляецца якраз той катэгорыяй, праз якую аўтар дэманструе нам рэчаіснасць. Глёбус стварае новую міфалогію, міфалогію Сучаснасці. Дамавік, Хатнік, Хут і Русалка, зрабіўшы падарожжа ў часе, перасяліліся на старонкі навел.

Што ж адбываецца? Патрабаванне Лоўрэнса аб адраджэнні першасных абрадаў і пачуццяў выканана. Незразумела толькі дзе ж Рай, які абяцаў нам заснавальнік неапаганства? " Мы павінны прайсці доўгі шлях...каб зноў знайсці глебу пад нагамі... Апошнія тры тысячы год былі адыходам у ідэал, бесцялеснасць і трагедыю, а зараз адыход скончаны..." (Лоўрэнс)

Дык ці ж можа з'яўляцца "глебай пад нагамі" той змрок, які з'яўляецца фонам да дзеяння міфалагічных істот? Сарказм Глёбуса, разбіваючы ўшчэнт пасылку Лоўрэнса, нараджае Антыміф.

Глёбус вопытным, эксперыментальным шляхам паказвае нягдольнасць Лоўрэнсавай тэорыі неапаганства ў дачыненні да сучаснасці. Мастак змадэляваў Сусвет і прэпарыраваў яго.

Велічныя міфалагічныя істоты мінулага сталі брыдкімі пачварамі, пачуццёвае каханне, узведзенае ў абсалют -- узведзеным у абсалют вычварэннем. Адам Глёбус эстэтычна сцвярджае філасофскую выснову Міхаіла Эпштэйна аб тым ,што "чыста жывёльнага ужо не існуе ў прыродзе, яно пераадолена, адухоўлена, і выдзеліць яго можна толькі ўмоўна, абстрагавана...Дэманічны эратызм вядзе не да адраджэння пачуццёвасці, на што разлічваюць неапаганцы, а да вычварэння духоўнасці... Пры гэтым церпіць страту не толькі духоўнасць, супраць якой накіраваны неапаганскі зварот да прыроды, але і тая першаснасць, якой яно імкнецца дасягнуць."

Верагодна пагэтаму з непрыяццем успрымаюцца так званыя скаталагічныя творы, якія ў пагоні за першаснай праўдай жыцця дасягаюць першаснай гідкасці, - таму, што немагчыма адкінуць усеабдымны вопыт чалавечай свядомасці, набыты шляхам цывілізацыі і культурнага развіцця.

Лічыцца , што Міф - гэта матэрыялізаваны Дух чалавецтва. Адам Глёбус, трансфармуючы Міф, трансфармуе Дух і паказвае вынік: героі трапляюць не да "сонца, заходу яго і ўсходу" (Лоўрэнс) - іх чакаюць сутарэнні, кватэры у шматпавярховых дамах, магазіны, пад`езды, ліфты . Дух, трапляючы у іх царства , перастае быць Духам. А Міф становіцца прадуктам хворага інтэлектуалізма. І ужо - не Міфам.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ